# ЗНАХАРСТВА НА БЕЛАРУСІ

**Марчык Дзіяна Браніславаўна, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

У маім дакладзе вы знойдзеце шмат цікавага пра беларускую народную медыцыну як пра плён шматвекавога калектыўнага вопыту, а таксама пра знахарства. Багатая спадчына знахарства пакуль мала вядома навуковай медыцыне. Яго пазнаннеможа даць многа карыснага і для навукі:аддзяліць у ім рацыянальнае ад недарэчнага, паказаць ролю народнага лячэння ў жыцці беларусаў  у прошлым і ў цяперашні час.

*Ключавыя словы: беларуская народная медыцына, знахарства, лекавыяраслiны, варажба, збор, магiя, фармакалогiя.*

# QUACKERY IN BELARUS

**Marchuk Dziana, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor – senior lecturer Ratunskaya N. V.*

In my report there are many interesting things about Belarusian traditional medicine as a result of long-term collective experience, as well you will learn a lot about quackery.Rich heritage of sorcery is still little known to scientific medicine. Its knowledge can give us a lot of useful information for science as well: separate the rational from the meaningless or show the role of people's treatment in the life of Belarusians in the past and nowadays.

*Keywords: Belarusian folk medicine, quackery, medicinal plants, divination, gathering, magic, Pharmacology.*

Гіпакрат Коскі, якога называюць бацькам заходняй медыцыны, быў грэчаскім доктарам, які  вядомы сваім адмаўленнем ад вераванняў,што ўключалі звышнатуральныя паходжанні хвароб. З даўніх часоў знахароў (таксама іх называюць чараўнікамі або сангамамі) людзі прасілі аб здароўі. Знахары ж праводзілі шаманскія абрады, якія ўзніклі яшчэ ў эпоху палеаліту (каменны век).

Нягледзячы на шматлікасць матэрыялаў па беларускай народнай медыцыне і знахарству, распрацоўкай гэтай тэмы амаль не займаліся ні беларускія этнографы, ні медыцынскія супрацоўнікі.

Беларуская народная медыцына – плён шматвекавога калектыўнага вопыту. Яе багатая спадчына пакуль мала вядома навуковай медыцыне. Пазнанне яе сродкаў можа даць многа карыснага і для навукі. Народная медыцына – гэта перш за ўсё культура народа.



Репозиторий БГМУ

Знахары знойдзены на Беларусі яшчэ ў канцыXVII ст. Так, летам 1926 г. навуковая экспедыцыя ў в.Мардашэвічы Дубравенскага раёна знайшла ў сялянкі Ганны Шаранды лячэбнік, па якім мясцовыя жыхары лячыліся на працягу многіх гадоў. Лячэбнік складаўся з 30 лістоў, напісаных на рускай мове, але сустракаецца беларускае “аканне”, “ў”. У лячэбніку апісана 77 раслін, большасць з іх мае беларускую назву. Многія знахары ўнеслі ў медыцыну шмат містычнага. Але, тым не менш, многія абрады, звязаныя са зборам раслін мелі рацыянальныя моманты. Так, расліны, сабраныя ў перыяд цвіцення і ў поўдзень, калі няма расы, лепш захоўваюцца. Сок збіралі вясной, корні – у канцы лета і восенню. У многія часы знахары замянялі сялянам лекара, а знахарка-павітуха – акушэрку. З далучэннем Беларусі да Расіі ў канцы XVIII стагоддзі ў гарадах Беларусі ўводзіцца пасада спавівальнай бабкі на дзяржаўнай службе. Для Беларусі спавівальных бабак рыхтавалі ў Беластоцкім спавівальным інстытуце (1802-1837) і ў Вільні. Але ўсё роўна акушэрская дапамога была недастатковай.

Нягледзячы на забароны рэлігіі, людзі звярталіся да знахарства і робяць гэта па сённяшні дзень.

Да акуліста звярнуўся хворы, які быў ужо амаль сляпым, і расказаў, што звяртаўся да знахаркі. Яна яму параіла тры разы кожны дзень скакаць цераз чорнага ката і піць нейкае зелле, але яму гэта не дапамагала, і толькі дапамога кваліфікаванага доктара прынесла станоўчы вынік.

Гэтую праблему закранаў І.Мележ у сваім творы “Людзі на балоце”, паказваючы трагедыю сваёй гераіні Хадоські, якая звярнулася да знахаркі, каб зрабіць аборт.

Трэба адзначыць, што ў народзе, бывала, знахары карысталіся павагай, але пры гэтым яны вельмі часта знаходзіліся пад падазрэннем у суседзяў. Так, напрыклад, многія знахары не маглі запаліць ноччу свет у хаце, каб суседзі не падумалі, што ён рыхтуе зелле, а нячыстая сіла яму дапамагае. Такое становішча вельмі часта рабіла знахараў самалюбівымі, самаўпэўненымі і суровымі. Галоўнае адрозненне паміж знахарамі і ведзьмакамі ў тым, што першыя хаваюцца ад людзей і стараюцца сваё рамяство ахутаць таямніцай, другія працуюць у адкрытую і без малітвы не распачынаюць справу. Але і да тых, і да другіх у народа склаліся дваістыя адносіны. Адны лічаць, што ім дапамагае Бог, а другія – нячыстыя сілы. Яшчэ адной сферай дзейнасці знахараў была варажба. Тысячагоддзямі варажба была дзіцём язычніцтва, народжаным ад страху, забабонаў. У сілу варажбы верылі, аб гэтым вобразна сказаў М. Багдановіч вуснамі сваёй гераіні Агаты: “Толькі б зведаць – і з воску фігуру / Я найменнем тваім ахрышчу, / Выйду ноччу на поле ў буру / І закляцце сваё напушчу”.

У сярэднявечча шмат увагі ўдзялялі астралагічным прагнозам – найбольш спрыяльным спалучэнням сузор’яў: “Скарына, доктар лекарскіх навук, / У доўгай вопратцы на вежы сочыць зоры. // Яны спрыяюць! Час! З рухавых рук / Скарыны п’е адвар пан земскі пісар хворы” .

Хваробы, з якімі звярталіся да знахараў, былі розныя. Найчасцей лячылі людзей ад гарачкі і ад усіх відаў чараў. Месца лячэння залежала ад характару



Рэпазіторый БГМУ

захворвання: хваробы, якія здараліся ад перапалоху, – каля вады, дзіцячыя хваробы – на парозе хаты. Вельмі часта знахар спецыялізаваўся на адной хваробе: дзіцячай бяссоніцы, зубным болі, укусе гадзюкі. Многія хваробы давяралі толькі жанчынам-знахаркам (асабліва дзіцячыя хваробы). Напрыклад, дыягностыкі захворвання сэрца народная медыцына не ведала. Розныя хваробныя сімптомы ў вобласці сэрца (боль, сэрцабіццё) вызначалася як "хвароба сэрца". Многія сродкі для лячэння, якія ўжываў народ, выкарыстоўваецца сёння ў медыцыне.Так, распаўсюджаным "сардэчным" сродкам у народнай медыцыне з'яўлялася арніка горная. Таксама з даўніх часоў у якасці сардэчнага сродку прымянялі напоі майскага ландыша. А. Антонаў пісаў аб выкарыстанні майскага ландыша: "Ландыш майскі прымяняецца пры нервовых захворваннях, пры хваробах сэрца". На поўдні Беларусі выкарыстоўвалі траву гарыцвета вясенняга. Яшчэ ў 1880 г. трава гарыцвета была праверана ў клініцы С.П. Боткіна і з таго часу прымяняецца ў медыцынскай практыцы.

Для паніжэння крывяного ціску прымянялі напоі расянкі круглалістай, сардэчнік. Для лячэння прастуды шырока выкарыстоўвалі цяпло (беларускі селянін у першую чаргу парыўся ў лазні). Але многія хваробы па ўяўленні людзей вызываліся жывымі стварэннямі. Адсюль і метады лячэння: выгнаць, вытаптаць хваробу. Напрыклад, калі ў дзіцяці быў радзімы знак, запрашалі жабрака і прасілі яго сваім посахам абвесці знак, каб яно не павялічвалася.

Старцам, як і ўсім падарожнікам, прыпісваліся варажбіцкія веды. Паслугі знахараў, якія аказваліся ўбогімі, былі своеасаблівай платай за ежу і прытулак. Вельмі часта знахаркі займаліся любоўнай магіяй. Напрыклад, "здымалі смутак" з таго чалавека, які згубіў каханне. У народзе лічылі, што знахарка можа вярнуць мужа ў сям'ю, калі той мае палюбоўніцу. Для гэтага патрэбна ўзяць ліпавае палена і адшчапіць дзве лучынкі. Калі муж устане з пасцелі, патрэбна пакласці гэтыя лучынкі крыж-накрыж на ложку і прамовіць загаворныя словы.

Знахарская справа заўсёды спасцігаецца. Звычайна вопытны знахар навучае таго, хто толькі пачынае, і ў гэтым знахарства падобна да рамяства.

Знахарству можа навучыцца кожны, але звычайна яно перадаецца "па крыві" – ад маці да дачкі, унучцы, а калі ў жанчыны няма дачкі – то да нявесткі. Але калі ў родных не выяўлены такія здольнасці, то знахар павінен перадаць свае веды чужым людзям.

Знахарства распаўсюджана на тэрыторыі славян, таксама як і ў грэкаў, і рымлян. Сягоння таксама захоўваецца моцная вера ў знахарства, але выкарыстоўваюцца ў дачыненні да іх новыя тэрміны "медыўмы", "празорлівыя". У газетах можна прачытаць аб'явы з паслугамі, якія прапаноўваюць магію. Людзям вельмі часта пасля звяртання да такіх паслуг аказваецца медыцынская і псіхалагічная дапамога. Таму дадзеную праблему неабходна вывучаць надалей, каб рэшткі гэтых уяўленняў не схаваліся пад тоўшчай сучасных вымышленняў і спекуляцыяй на тэму магіі і варажбы.

Репозиторий БГМУ

Літаратура


1. Мінько, Л.І. Народная медыцына (кароткі гістарычны нарыс) / Л.І.Мінько. - Мінск, 1969.
2. Склярова, Е.К., Жаров, Л.В. История медицины /Е.К. Склярова, Л.В. Жаров. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2015. – 345с.
3. Грицкевич, В.П. С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. В.П. Грицкевич, Селиванов Е.Ф. - Мн: Наука и техника, 1987. – 271 с.